РЭСПУБЛІКАНСКІ МЕТАДЫЧНЫ КАБІНЕТ
МІНІСТЭРСТВА АСВЕТЫ БССР

# ПРЫКЛАДНАЕ ПЛАНАВАННЕ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПА ГІСТОРЫІ БССР У КУРСЕ ГІСТОРЫІ СССР ДЛЯ VII-Х КЛАСАЎ

Метадычныя парады

МІНСК 1973

Тлумачальная запіска

Згодна з праграмай па гісторыі для васьмігадовай і сярэдняй школы на 1972/73 навучальны год, гісторыя Беларусі вывучаецца на аснове агульнага курса гісторыі СССР у сувязі з вывучэннем яго асобных тэм. Матэрыял па гісторыі БССР даецца ў храналагічнай паслядоўнасці ў адпаведных тэмах па гісторыі СССР. Гэта азначае, што пытанні гісторыі БССР трэба вывучаць пасля таго, як вучні пазнаёмяцца з аналагічнымі тэмамі па гісторыі СССР. Напрыклад, факты з жыцця старажытнейшых людзей на тэрыторыі Беларусі разглядаюцца на ўроку гісторыі СССР пасля вывучэння тэмы "Старажытнейшыя жыхары нашай краіны". Асобны ўрок гісторыі БССР "Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі" праводзіцца пасля ўрока гісторыі СССР "Усходнія славяне ў старажытнасці".

Глыбіня і трываласць ведаў вучняў па гісторыі БССР залежаць ад правільна арганізаванага паўтарэння вывучаемага матэрыялу. Таму на абагульняючых уроках па такіх тэмах гісторыі СССР, як "Старажытная Русь.Раннефеадальная дзяржава з цэнтрам у Кіеве", "Феадальная раздробленасць на тэрыторыі нашай краіны", "Пачатак разлажэння феадалізму. Развіццё капіталістычных адносін у Расіі" і іншых, неабходна ўключаць матэрыял з гісторыі БССР.

Паўтарэнне па асобных тэмах гісторыі Беларусі дазваляе абагуліць і сістэматызаваць у свядомасці вучняў матэрыял за працяглы гістарычны перыяд, усвядоміць вывучаныя з'явы ў іх асноўных сувязях і абумоўленасці. Тым самым аблягчаецца ства-

рэнне ў вучняў цэласнага ўяўлення пра важнейшыя падзеі і з'явы гісторыі рэспублікі.

Абагульняючае паўтарэнне служыць замацаванню ведаў вучняў аб заканамернасцях і некаторых асаблівасцях гістарычнага развіцця Беларусі, дапамагае настаўніку своечасова ўбачыць прабелы ў ведах вучняў і выправіць іх.

Яно можа ажыццяўляцца як адначасова з матэрыялам агульнага курса гісторыі СССР, так і на спецыяльна адведзеным для гэтага ўроку. Мэтазгодна, напрыклад, у 7-ым класе правесці абагульняючы ўрок па тэме "Узнікненне і развіццё феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі ў IX-XУШ стст.". У ходзе гэтага ўрока настаўнік атрымае магчымасць сістэматызаваць веды вучняў пра асноўныя этапы развіцця феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі, замацаваць засвоеныя раней паняцці пра феадалізм.

У адпаведнасці з праграмай па гісторыі СССР, якая даволі поўна вызначае асноўныя тэмы па гісторыі Беларусі і выразна акрэслівае іх змест, складзены I-ая і 2-ая графы прапануемага прыкладнага планавання вучэбнага матэрыялу гісторыі БССР у курсе гісторыі СССР.

У трэцяй графе названы творы класікаў марксізму-ленінізму і партыйныя дакументы, у якіх дадзена ацэнка гістарычнага развіцця Беларусі.

Вядома, якое вялікае выхаваўчае і пазнавальнае значэнне мае выкарыстанне выказванняў класікаў марксізму-ленінізму і палажэнняў партыйных дакументаў. Іх выкарыстанне дапамагае старшакласнікам глыбей зразумець агульны ход гістарычнага



развіцця грамадства, з класавых, партыйных пазіцый ацэньваць з'явы грамадскага жыцця. Напрыклад, выходным момантам пры вывучэнні развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палавіне XIX стагоддзя з'яўляецца ленінскае палажэнне аб тым, што беларускія губерні адносяцца да "важнейшага раёна земляробчага капіталізму", у якім пераважнае значэнне мела вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі, што атрымала тут малочнагаспадарчы напрамак /Полн.собр.соч., т.3, стр.256/. Для правільнага вызначэння ўзроўню развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі вельмі важна выкарыстаць на ўроку ленінскае выказванне аб распаўсюджванні капіталістычнай і адработачнай сістэм у сельскай гаспадарцы Беларусі канца XIX стагоддзя /Полн.собр.соч., т.3, стр.185-188/, а таксама спасылкі У.І.Леніна на тэхнічны прагрэс у сельскай гаспадарцы Беларусі таго ж перыяду /Полн.собр.соч., т.17, стр.79/.

У многіх творах У.І.Ленін даў таксама характарыстыку сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў дарэвалюцыйны і паслярэвалюцыйны перыяды.

Настаўніку гісторыі патрэбна заўсёды помніць, што выкарыстанне выказванняў класікаў марксізму-ленінізму і палажэнняў партыйных дакументаў будзе спрыяць далейшаму павышэнню тэарэтычнага ўзроўню выкладання гісторыі БССР, паглыбленню ведаў вучняў, фарміраванню камуністычнага светапогляду.

Вельмі важна, каб вучні разумелі ленінскія палажэнні, умелі канкрэтызаваць гэтыя палажэнні на жывым гістарычным матэрыяле, прымянялі іх пры аналізе грамадскіх з'яў мінулага і сучаснасці.

У працэсе выкладання гісторыі БССР вывучаюцца важнейшыя па-

лажэнні тэзісаў ЦК КПСС "50 год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі", пастановы ЦК КПСС "Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі", тэзісаў ЦК КПСС "Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна", матэрыялаў XXIУ з'езда партыі, матэрыялаў XXУП з'езда КПБ, пастановы ЦК КПСС "Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік", якія адлюстроўваюць эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё і перспектыву Беларусі ў гады будаўніцтва сацыялізма і камунізма.

Гістарычныя паняцці, якія фарміруюцца ў вучняў на асобных уроках гісторыі БССР або пры вывучэнні пытанняў гісторыі БССР на ўроках гісторыі СССР, названы ў чацвёртай графе плана. Пры гэтым неабходна звярнуць увагу на тое, што частка паняццяў выдзелена ў прыкладным планаванні разрадкай. Гэтыя гістарычныя паняцці рэкамендуецца паглыбляць, карыстаючыся выказваннямі класікаў марксізму-ленінізму, якія настаўнік знойдзе на тых старонках іх твораў, што названы ў прыкладным планаванні. Так, на асобным уроку "Барацьба беларускага народа супраць феадальнага прыгнёту ў другой палавіне XУI- першай палавіне XУП стагоддзяў" настаўнік будзе мець магчымасць паглыбіць паняцці "феадальны прыгнёт" і "класавая барацьба", кіруючыся ленінскімі палажэннямі з артыкула "Да вясковай беднаты" /В.И.Ленин. Полн.собр.соч., т.7, стр. 193-194/.

Вядома, што ўдасканальваць і паглыбляць веды вучняў асноўнымі гістарычнымі фактамі - гэта адна з важнейшых задач вывучэння гісторыі БССР у школе. Так, вучні павінны ведаць, як



жылі першабытныя людзі на тэрыторыі Беларусі, як змагаліся ўсходнія славяне, абараняючы родную краіну ад нашэсця крыжаносцаў, як свабодны абшчыннік-славянін быў ператвораны ў прыгоннага селяніна. Яны павінны ведаць аб барацьбе беларускага народа супраць феадальнага прыгнёту, аб вызваленчай вайне беларускага народа ў сярэдзіне XУП стагоддзя. Ім павінны быць добра знаёмы вобразы дзекабрыстаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, першых беларускіх рабочых - рэвалюцыянераў. Вучням неабходна зразумець ход Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Беларусі, размах партызанскай барацьбы на Беларусі супраць нямецкіх захопнікаў у 1918 годзе і буржуазна-памешчыцкай Польшчы ў 1919-1920 гг., кіруючую ролю партыі ў арганізацыі партызанскай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Асабліва вялікая ўвага ўдзяляецца ў курсе гісторыі БССР пытанням, як стваралася беларуская дзяржаўнасць і Кампартыя Беларусі, як беларускі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі разам з іншымі народамі Савецкага Саюза пабудаваў сацыялізм і будуе камунізм.

Засваенне гэтых і многіх іншых гістарычных фактаў дапамагае стварэнню ў вучняў сістэмы канкрэтна-гістарычных уяўленняў, а таксама фарміраванню ў вучняў важнейшых гістарычных паняццяў.

Гістарычныя паняцці, якія прапануюцца ў прыкладным планаванні для далейшага паглыблення ў курсе гісторыі БССР, маюць не толькі пазнавальны, але і выхаваўчы змест.

У прыкладнае планаванне ўключаны тры групы гістарычных паняццяў:

а/ Канкрэтна-гістарычныя паняцці, якія адлюстроўваюць

і абагульняюць гістарычныя падзеі і з'явы, характэрныя для пэўнага перыяду ў гісторыі Беларусі. Напрыклад, паняцці "магдэбургскае права", "дзякло", "чынш", "валочная памера", "фальварак" адлюстроўваюць з'явы з жыцця беларускіх зямель у XIУ - першай палавіне XУI стагоддзя. Канкрэтна-гістарычныя паняцці, як правіла, параўнальна простыя і могуць быць раскрыты на працягу некалькіх мінут або ў рамках аднаго ўрока. Гэтыя паняцці спрыяюць паказу некаторых асаблівасцей гістарычнага развіцця Беларусі.

Аднак канкрэтна-гістарычных паняццяў маецца ў гісторыі Беларусі невялікая колькасць. Гэта тлумачыцца тым, што беларуская народнасць, таксама як руская і украінская народнасці, утваралася на аснове адзінай старажытнарускай народнасці. А таму ў сацыяльна-эканамічным развіцці, мове, культуры, звычаях беларусаў, рускіх і ўкраінцаў засталося назаўсёды многа агульнага.

Канкрэтна-гістарычныя паняцці можна скарыстаць для паглыблення агульнагістарычных і сацыялагічных паняццяў, аб якіх будзе гаварыцца пазней.

б/ Агульнагістарычныя паняцці ўласцівы канкрэтнай грамадска-эканамічнай фармацыі: "феадальны лад", "натуральная гаспадарка", "феадальная раздробленасць", "прыгоннае права". Яны ўяўляюць больш высокую ступень абагульнення. Агульнагістарычныя паняцці больш складаныя для вучняў і фарміруюцца шляхам сістэматычнай работы на ўроках у рамках тэмы, а часам - на працягу шэрагу раздзелаў курса гісторыі СССР і БССР.

в/ Сацыялагічныя паняцці паказваюць агульныя сувязі і заканамернасці гістарычнага працэсу. Такія паняцці, як "клас", "дзяржава", класавая барацьба", "культура" і іншыя, з'яўляюцца найбольш складанымі і найбольш агульнымі паняццямі. Яны раскрываюцца, паглыбляюцца, абагульняюцца і фарміруюцца на матэрыяле ўсяго школьнага курса гісторыі, у тым ліку на матэрыяле гісторыі БССР.



Развіццё і абагачэнне агульнагістарычных і сацыялагічных паняццяў ажыццяўляецца шляхам іх далейшай канкрэтызацыі, шляхам раскрыцця іх новых бакоў. Таму мэтазгодна ў тым парадку, як гэта прапанавана ў прыкладным планаванні, паступова накопліваць канкрэтныя ўяўленні аб агульнагістарычных і, асабліва, сацыялагічных паняццях, з вылучэннем іх істотных адзнак.

Названая ў пятай графе прыкладнага планавання навукова-папулярная літаратура дапаможа настаўніку не толькі ў тэарэтычнай падрыхтоўцы да ўрокаў, але і ў арганізацыі самастойнай работы вучняў на ўроках і асабліва пры падрыхтоўцы да іх. Яна можа стаць адной з крыніц для паглыблення ведаў па гісторыі БССР у пазакласнай рабоце. Навукова-папулярная літаратура дапамагае настаўніку падняць веды вучняў на новую ступень, улічваючы дасягненні савецкай гістарычнай навукі.

Трэба адзначыць, што да некаторых выданняў настаўніку карысна звяртацца пастаянна. У першую чаргу гэта адносіцца да наступных выданняў:

Гісторыя Беларускай ССР. Том. I, Мінск, Выдавецтва "Навука і тэхніка", 1972.

Гісторыя Беларускай ССР. Том.П, Мінск, Выдавецтва АН БССР, 1961.

Зуеў Е.М., Капыскі З.Ю. Хрэстаматыя па гісторыі БССР.

ч.І, Мінск, Вучэбна-педагагічнае выдавецтва, 1961.

Марчанка І.Е. Хрэстаматыя па гісторыі БССР. ч.П, Мінск, Вучэбна-педагагічнае выдавецтва, 1962.

Хроніка найважнейшых падзей гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі /1883-1918 гг./. Ч.І, Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1962.

Хроніка найважнейшых падзей гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі /1919 г.- чэрвень 1941/. Ч.П, Мінск, Выдавецтва "Беларусь", 1970.

Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі /1883-1920/. Ч.І. Мінск, Выдавецтва "Беларусь", 1968.

Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі /1921-1966/. Ч.П. Мінск, Выдавецтва "Беларусь", 1967.

У некаторых выпадках, калі гэта неабходна, вучні могуць самі надрыхтаваць невялікія паведамленні, карыстаючыся той навукова-папулярнай літаратурай, якая названа ў прыкладным плаванні. З гэтай мэтай указваецца не агульная колькасць старонак твора, а канкрэтныя старонкі. Напрыклад, тэма ўрока "Вызваленчая вайна беларускага народа ў сярэдзіне ХУПст." дае магчымасць настаўніку выкрыць сцвярджэнні амерыканскіх і заходне-еўрапейскіх фальсіфікатараў гісторыі Беларусі па пытаннях аб узаемаадносінах і ўзаемасувязях усходнеславянскіх народаў.

Канкрэтныя ж звесткі аб непарушнай дружбе брацкіх славянскіх народаў, якая мае глыбокія гістарычныя карэнні, настаўнік і вучні знойдуць у кнігах Л.С.Абецадарскага "Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне ХУП стагоддзя" /Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1954/, "У святле неабвержаных фактаў" /Мінск, "Звязда", 1969, стар. 65-80/.



Настаўніку мэтазгодна выкарыстаць шырокія магчымасці, якія прадастаўляюць для выхавання вучняў навукова-папулярныя, хранікальна-дакументальныя і мастацкія кінафільмы па гісторыі БССР:

Я, Францыск Скарына;

Архітэктурныя помнікі старыны;

Героі Брэста;

Марат Казей;

Канстанцін Заслонаў.

У дадатак уключаны таксама спіс літаратуры па метадыцы выкладання гісторыі БССР у сярэдняй школе і спіс наглядных дапаможнікаў.

| Раздзелы, тэмы і асноўны змест курса гісторыі СССР[I] | Пытанні гісторыі БССР, якія вывучаюцца на ўроках гісторыі СССР або на асобных уроках | Творы класікаў марксізму-ленінізму і партыйныя дакументы | Пагдыбленне гістарычных паняццяў | Навуковая і навукова-папулярная літаратура па гісторыі БССР |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| | | УП клас | | |
| Раздзел I<br>Першабытнаабшчынны лад і рабаўладальніцкі лад у гісторыі нашай краіны.<br>I.Старажытнейшыя жыхары нашай краіны. | Найстаражытнейшыя пасяленні людзей на тэрыторыі Беларусі. | | Першабытнаабшчынны лад, праца, грамадская маёмасць, мацярынская родавая абшчына, прылады працы. | К.М.Поликарпович.Палеолит Верхнего Поднепровья. Мн., "Наука и техника",1968, стр.15-36, 186-190.<br>Э.М.Загорульский. Археология Белоруссии. Мн.,Изд-во"Высшая школа", 1965, стр.7-34. |
| 2.Усходнія славяне ў старажытнасці. | Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі БССР.<br>/I гадзіна/. | В.И.Ленин. Что такое "друзья народа" и как они воюют против социал-демократов? Полн.собр.соч., т.I,стр.152; Соч.,т.I,стр. 136. | Праца,разлажэнне першабытнаабшчыннага ладу, бацькаўская родавая абшчына, рэлігійныя вераванні,п р ы в а т н а я ў л а с н а с ц ь, суседская абшчына. | В.А.Жучкевіч.Тапаніміка Беларусі. Мінск, "Навука і тэхніка",1968,стар.123-130.<br>М.С.Кацер.Белорусская архитектура. Мн.,Госиздат БССР, 1956, стр.9-15. |

I. У схеме названы толькі тыя тэмы па гісторыі СССР, у складзе або пасля якіх вывучаецца матэрыял па гісторыі БССР.Раздзелы, тэмы і асобныя ўрокі гісторыі СССР названы па дзеючых вучэбных дапаможніках і падручніках гісторыі СССР за 1972 год.



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел П<br>Старажытная Русь.<br>Раннефеадальная дзяржава з цэнтрам у Кіеве.<br>3.Народныя паўстанні.Феадальныя ўсобіцы. | Заходнія землі старажытнай Русі ў IX-XI стст.<br>/I гадзіна/. | В.И.Ленин. О государстве. Полн.собр.соч., т.39,стр.73-76;Соч.,т.29, стр.441-444.<br>В.И.Ленин. Карл Маркс. Полн.собр.соч., т.26,стр.75; Соч.,т.21,стр. 56. | Роля працы ў развіцці грамадства, разлажэнне першабытнаабшчыннага ладу, класы, д з я р ж а в а, класавая барацьба, усобіцы феадалаў, старажытнаруская народнасць. | Г.В.Штыхаў.Галасы далёкіх продкаў. Мн.,"Беларусь", 1969,стар.29-50.<br>Л.С.Абецадарскі. У святле неабвержаных фактаў. Мн.,Выд. "Звязда",1969,стар.9-16.<br>Г.В.Штыхаў,П.Ф.Лысенка.Старажытнейшыя гарады Беларусі. Мн.,"Навука і тэхніка",1966. 84с. |
| Раздзел Ш<br>Феадальная раздробленасць на тэрыторыі нашай краіны.<br>4.Галіцка-Валынскае княства. Вынікі феадальнай раздробленасці. | Феадальная раздробленасць заходніх земель Старажытнай Русі /I гадзіна/. | | Натуральная гаспадарка, феадальная раздробленасць, феадальныя павіннасці. | Э.М.Загарульскі.Старажытны Мінск. Мн.,Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1963,стар.25-104.<br>Л.Алексеев.Полоцкая земля в IX-XIIIвв.М.,"Наука ", 1966, стр.237-288. |
| 5. | Культура заходніх земель старажытнай Русі /IX-XIIIстст./<br>/I гадзіна/. | | Культура,старажытнаруская культура, архітэктура. | Э.М.Загарульскі. Старажытны Мінск. Мн.,Дзяржвыд БССР,1963, стар.51-104.<br>М.С.Кацер.Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода. Мн.,"Наука и техника", 1969, стр.13-30. |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | | | М.С.Кацер. Белорусская архитектура. Мн.,Госиздат БССР, 1956, стр.16-27. |
| 6.Барацьба рускага народа і народаў Прыбалтыкі са шведскімі і нямецкімі феадаламі. | Барацьба насельніцтва заходніх зямель старажытнай Русі супраць іншаземных захопнікаў у XIII ст. /I гадзіна/. | | Агрэсія, народныя масы, народнае апалчэнне, іншаземныя захопнікі. | В.Т.Пашута.Гераічная барацьба рускага народа за незалежнасць /XIIIст./. М.,Госполитиздат ,1956, 279с. С.А.Шчарбакоў.Барацьба беларускага народа супраць нямецкай агрэсіі ў XIII-XVстст. Весці АН БССР. Серыя грам. навук, 1966,№1,стар.60-69. |
| Раздзел IV Утварэнне і развіццё рускай цэнтралізаванай дзяржавы. 7.Руская цэнтралізаваная дзяржава ў канцы XV - пачатку XVI стагоддзя. | Беларускія землі ў XIV - першай палавіне XVI стагоддзя. /I гадзіна/. | | Народнасць, прыгоннае права,цэнтралізаваная феадальная дзяржава, магдэбурскае права, дзякло,чынш, валочная памера, фальварак. | М.Я.Гринблат.Белорусы.Минск, "Наука и техника",1968,стр. 40-57, 174-286. Я.І.Карнейчык.Беларуская нацыя. Мн.,"Навука і тэхніка", 1969,стар.15-38. З.Ю.Копысский.Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI-первой половине XVIIст. Мн., "Наука и техника",1966, 227с. |
| 8.Развіццё культуры ў XIV-XVIстст. | Беларуская культура XIV-XVIстст. /I гадзіна/. | | Культура,архітэктура,кнігадрукаванне, летапіс,народная творчасць,брацтвы. | Л.С.Абецадарскі. У святле неабвержаных фактаў. Мн.,Выд. "Звязда", 1969,стар.81-97. В.И.Пичета.Белоруссия и Литва XV-XVIвв. М., Изд-во АН СССР, стр.633-714. С.К.Майхровіч.Георгий Скарына. Мн.,"Беларусь",1966.187с. |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел V Сялянская вайна ў пачатку XVIIст. Барацьба з інтэрвенцыяй польскіх і шведскіх феадалаў. 9.Барацьба рускага народа супраць польскіх і шведскіх захопнікаў у пачатку XVII стагоддзя. | Барацьба беларускага народа супраць феадальнага прыгнёту ў другой палавіне XVI-першай палавіне XVII ст. /I гадзіна/. | В.И.Ленин. К деревенской бедноте.Полн. собр.соч., т.7,стр.193-194;Соч.,т.6, стр.384. | Феадальна-прыгонніцкі лад, феадальны і рэлігійны прыгнёт, класавая барацьба, талокі, гвалты, інвентары, унія. | Л.С.Абецадарскі. У святле неабвержаных фактаў. Мн., Выд."Звязда", 1969,стар. 65-80. Я.Н.Мараш.Ватикан и католическая церковь в Белоруссии. Мн.,"Вышэйшая школа",1971,стр.39-107. С.А.Подокшин.Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы /вторая половина XVI - начала XVII в./.Мн., "Наука и техника",1970,224с. |
| 10.Прыгнечанне ўкраінскага і беларускага народаў польскімі феадаламі. Запарожжа. | Вызваленчая вайна беларускага народа ў сярэдзіне XVIIст. /I гадзіна/. | В.И.Ленин. Социализм и война. Полн. собр.соч., т.26,стр.311; Соч.,т.21,стр. 271. | Нацыянальна-вызваленчая вайна, народныя масы. | Л.С.Абецадарскі.Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII ст. Мн.,Дзяржвыд БССР,1954,стар. 18-66. Л.С.Абецадарскі. У святле неабвержаных фактаў.Мн., "Звязда",1969,стар.65-80. |
| 11.Развіццё культуры Расіі ў XVII стагоддзі. | Беларуская культура ў XVIIст. /I гадзіна/. | Ф.Энгельс.Анти-Дюринг.М., 1967,стр.321-322; Соч.,Изд. II, т.20,стр. 328-329. | Народная творчасць, Матэрыяльная і духоўная культура,народ-стваральнік культуры, рэлігія. | М.Алексютовіч. З глыбінь стагоддзяў /К.Лышчынскі/. "Полымя",1966,№ 1,стар.142-- 149. |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел УП Далейшае развіццё феадальнай Расіі. Утварэнне Расійскай імперыі. | | | | І.С.Абецадарскі.Беларусы ў Маскве ХУП ст.Мн.,Выд.БДУ. 1957, 61с. |
| 12.Пачатак Паўночнай вайны. | Удзел беларускага народа ў барацьбе супраць шведскіх захопнікаў у гады Паўночнай вайны. Бітва пры Лясной. | | Умацаванне дружбы народаў нашай краіны, блакада,сепаратны мір. | З.Ю.Капыскі.Бітва пад Лясной у 1708 годзе. Мн., Дзяржвыд БССР, Рэдакцыя паліт.літ.,1958,44с. Л.Д.Клок."....по лесам мужики зело бьют их"."Помнікі гісторыі і культуры", 1970, № 3, стр.31-37. |
| Раздзел УІІІ Пачатак разлажэння феадалізму і развіццё капіталістычных адносін у Расіі ў другой палавіне ХУІІІст. | | | | |
| 13.Царызм у барацьбе супраць французскай буржуазнай рэвалюцыі. | Уз'яднанне Беларусі з Расіяй. /1 гадзіна/. | К.Маркс и Ф.Энгельс. Энгельс – Марксу, 23 мая 1851. Соч.,Изд.П, т.27,стр.240-241. | Усерасійскі рынак, нацыянальны прыгнёт,уз'яднанне,эканамічны пад'ём. | П.Г.Козловский. Крестьяне Белоруссии во второй половине ХУП-ХУШвв.Мн.,"Наука и техника",1969. 203с. Д.Л.Похилевич. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине ХУШ в.Вильнюс, АН Литовской ССР, 1966.216с. |
| 14.Культура Расіі ў сярэдзіне і другой палавіне ХУШст. | Культура Беларусі ў ХУШст. | В.И.Ленин.О карикатуре на марксизм и об" империалистическом экономизме". Полн.собр.соч. т.30,стр.46. | Н а ц ы я н а л ь н а - р э л і г і й н ы п р ы г н ё т. | Л.І.Якуніна.Слуцкія паясы. Мн.,Выд.АН БССР,1960. 239с. М.С.Кацер.Белорусская архитектура. Мн.,Госиздат БССР, 1956, стр.55-87. |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | УШ клас | | |
| Раздзел І Унутраная і знешняя палітыка самадзяржаўя ў пачатку ХІХ стагоддзя.Айчынная вайна. 1.Уздым народнай вайны. | Удзел беларускага народа ў барацьбе супраць напалеонаўскіх захопнікаў /1гадзіна/. | В.И.Ленин.О брошюре Юниуса. Полн.собр.соч., т.30,стр.5;соч., т.22,стр.295. | Айчынная вайна, народная вайна, партызанскі рух, роля народных мас у гісторыі. | Я.і.Карнейчык. Беларускі народ у Айчыннай вайне 1812г. Мн., Дзяржвыд БССР,1962.117с. |
| Раздзел П Пачатак дваранскага этапа вызваленчага руху ў Расіі. 2.Паўстанне дзекабрыстаў. | Рух дзекабрыстаў у Беларусі."Таварыства ваенных сяброў".Спроба паўстання у Бабруйску. | | Рэвалюцыйны рух, рэвалюцыянер, узброенае паўстанне. | А.Співачук.Дзекабрысты ў Бабруйску. Ж."Маладосць",1968,№7,стар. 154-157. Е.Бравер.Дзекабрысты на Беларусі. Ж."Маладосць", 1966,№ 10. |
| Раздзел Ш Сацыяльна-эканамічнае развіццё народаў Расіі. Крызіс прыгонніцтва. 3.Эканамічнае развіццё Расіі ў першай палавіне ХІХ ст. | Развіццё капіталістычных адносін у першай палавіне ХІХ ст. /1 гадзіна/. | В.И.Ленин.Развитие капитализма в России. Полн.собр.соч., т.3,стр.21-23, 173-174;Соч., т.3,стр.21-23, 148. | Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы,капіталістычныя адносіны, у с е р а с і й с к і р ы н а к, мануфактура, фабрыка, наёмныя рабочыя. | М.Ф.Болбас.Развіццё прамысловасці ў Беларусі /1795-1861гг./. Мн., "Навука і тэхніка",1966,стар.7-43, 193-235. В.У.Чапко.Сельская гаспадарка Беларусі ў першай палавіне ХІХ ст. Мн., "Навука і тэхніка",1966,220с. |

| I | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 4.Сялянскі і нацыянальна-вызваленчы рух. | Сялянскі рух у Беларусі ў першай палавіне XIX ст. /п.4,5/. | | Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы, сялянскі рух. | І.С.Краўчанка.Як жылі і змагаліся за сваё вызваленне працоўныя Беларусі ў дарэвалюцыйнай Расіі. Мн. Дзяржвыд БССР,Рэд. паліт.літ., 1953,83с. |
| Раздзел УI Культура Расіі ў першай палавіне XIX ст. 5.Літаратура. | Беларуская культура ў першай палавіне XIXст. | | Нацыянальны прыгнёт, дэмакратычная культура. | С.Майхровіч.Нарысы беларускай літаратуры XIX ст.Мн., Вучпедвыд МП БССР, 1959,стар 3-128. Л.А.Молчанова.Материальная культура белорусов. Мн., "Наука и техника",1968, 231с. |
| Раздзел УII Буржуазныя рэформы 60-70-х гадоў XIX ст. 6.Уздым рэвалюцыйнага руху ў 60-х гадах XIX ст. | Адмена прыгоннага права ў Беларусі. Канстанцін Каліноўскі / I гадзіна/. | В.И.Ленин. По поводу юбилея. Полн.собр. соч.,т.20, стр.I67-I68; Соч.,т.I7,стр. 90-91. В.И.Ленин. "Крестьянская реформа" и пролетарски-крестьянская революция. Полн.собр. соч., т.20, стр. I73-I78; Соч., т.I7, стр.94-89. | Адмена прыгоннага права,рэвалюцыйная сітуацыя, рэвалюцыйна-дэмакратычны рух, нацыянальна-вызваленчы рух, ўзброенае паўстанне. | М.Б.Фрыдман.Адмена прыгоннага права ў Беларусі. Мн., Выд.БДУ, 1958,202с. А.Якімовіч.Кастусь Каліноўскі.Мн.,"Беларусь",1971. 248с. А.Ф.Смирнов.Восстание I863 года в Литве и Белоруссии. М. Изд-во АН БССР, 1963,стр. I0I-347. |



| I | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел УШ Эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў другой палавіне XIXст. 7.Развіццё капіталістычнай прамысловасці. | Развіццё капіталізму ў Беларусі ў другой палавіне XIX ст. /Iгадзіна/. | В.И.Ленин.Развитие капитализма в России. Полн.собр.соч., т.3,стр.I85-I88,I92-I93, 239;Соч.,т.3, стр.I59-I62, I63-I65,222, 206. В.И.Ленин.Аграрный вопрос в России к концу XIX века. Полн.собр.соч., т.I7,стр.76,79; Соч.,т.I5,стр. 69,72. | Капіталістычны лад,расслаенне сялянства,таварна-грашовыя адносіны, капіталістычная вытворчасць,фабрыка,фарміраванне рабочага класа і буржуазіі. | З.Е.Абезгауз.Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., "Наука и техника",I971,I79с. Л.П.Ліпінскі.Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі /другая палавіна XIX ст./.Мн.,"Навука і тэхніка",I971.254 с. |
| Раздзел IX Рэвалюцыйны рух ў 70-х-пачатку 90-х гадоў XIX ст. 8.Рэвалюцыйная барацьба народнікаў. | Народніцтва ў Беларусі. | | Народніцтва,рэвалюцыйныя народнікі. | Р.Булацкі.Беларускія народнікі."Беларусь", 1969,№ 3,стар. 28. У.Л.Мехаў. Слухаецца справа аб замаху... Мн., "Беларусь" 1972, I51 с. |
| Раздзел X Пачатак пралетарскага этапу вызваленчага руху. 9."Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа". | Рабочы рух у Беларусі ў80-90-х гадах XIX ст. | В.И.Ленин.Наша ближайшая задача.Полн. собр.соч.,т.4, стр.I87;Соч., | Масавы рабочы рух, сацыял-дэмакратычныя арганізацыі,забастоўка,стачка, дэманстрацыя,партыя, | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі. | | устаў, праграма. | Е.И.Бугаев.Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии. М.,Госполитиздат, 1959,стр.5-21. В.П.Панютич.Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861-1914гг.Мн.,"Наука и техника",1969.190с. В.м.Иванов. Очерк быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии. Мн.,"Наука и техника", 1971, 159с. |
| Раздзел XI Культура народаў Расіі ў II-ой палавіне XIX ст. 10.Рускае мастацтва. | Беларуская культура другой палавіны XIXст. /1 гадзіна/. | В.И.Ленин.Критические заметки по национальному вопросу.Полн.собр.соч.,т.24,стр.129-130;Соч.,т.20,стр.15-17. | Грамадская свядомасць,народная асвета,навуковыя даследаванні,нацыя. | Г.В.Кісялеў.З думкай пра Беларусь.Мн.,"Беларусь",1966,318с. Л.М.Дробаў.Беларускія мастакі XIXстагоддзя.Мн.,"Беларусь",1971,стар.56-107. |

IX КЛАС

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел II Наспяванне рэвалюцыйнага крызісу ў Расіі ў пачатку XXст. 1. Стварэнне рэвалюцыйнай марксісцкай партыі ў Расіі. | Беларусь напярэдадні рэвалюцыі 1905-1907гг. /1 гадзіна/. | В.И.Ленин.Проект программы нашей партии. Полн.Собр.соч.,т.4.стр.230; | Партыя новага тыпу, імперыялізм,феадальна-прыгонніцкія перажыткі, | А.І.Воранава.Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гадоў.Мн.,Выд. АН БССР, 1960,стар.59-131. |



| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Раздзел IУ Рэвалюцыя 1905-1907 гадоў у Расіі - першая народная рэвалюцыя эпохі імперыялізму. | | В.И.Ленин.Кризис меньшевизма.Полн.собр.соч.,т.14,стр.164;Соч.,т.11,стр.320-321. | рэвалюцыйная сітуацыя, сацыял-дэмакратычныя арганізацыі, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. | К.І.Шабуня. Аграрнае пытанне і сялянскі рух у Беларусі ў рэвалюцыі 1905-1907гг. Мн., Выд. М-ва вышэйш.сярэд.і праф. адукацыі БССР, 1962,с.20-183. |
